# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ТАТАР ІЎЕЎШЧЫНЫ

**А. А. Рафаловіч**

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск*

Навуковы кіраўнік В. А. Кузьміч

Сёння, калі актыўна ідзе працэс адраджэння нацыянальнай самасвядомасці, выкліканы зменамі ў грамадстве, трэба рабіць усе магчымае, каб захаваць сваю духоўную спадчыну. Абавязак кожнага грамадзяніна – захаваць народную скарбніцу, зберагчы яе для нашчадкаў.

На тэрыторыі Беларусі як на скрыжаванні шляхоў шмат стагоддзяў суіснавалі розныя народы. Часовыя кантакты перарасталі ў пастаянныя сувязі, што прыводзіла да супольнага пражывання розных народаў: літоўцаў, палякаў, рускіх, татар, яўрэяў. На гэтай падставе тут стварылася асаблівае этнакультурнае асяроддзе, у якім адбывалася фарміраванне і дзейнасць кожнай нацыі і народнасці ў рамках адзінага жыццевага арэалу, што ўплывала на фарміраванне нацыянальных рыс характару кожнага народа. Але ва ўсіх іх есць агульначалавечыя каштоўнасці, прызнанне якіх забяспечвае захаванне татарамі этнічнай самабытнасці, чалавечай годнасці, садзейнічае выхаванню павагі да іншых народаў, да працы, навакольнага асяроддзя.

На Іўеўшчыне ў згодзе жывуць разам розныя народы. Іўеўская зямля стала радзімай для рускіх і беларусаў, яўрэяў і палякаў, армян, азербайджанцаў і іншых народаў. Знайшлі сваю радзіму тут і татары. Больш за шэсць стагоддзяў жывуць на гэтай зямлі нашчадкі выхадцаў з даўно забытых ордаў, жывуць поплеч з беларусамі, палякамі… Тут іх радзіма, гэтай зямлі больш за шэсць стагоддзяў служылі іх продкі.

Сёння гэта вялікая этнічная супольнасць так і завецца – беларускія татары. Жывучы побач з талерантнымі міралюбівымі беларусамі, яны і самі з цягам часу сталі такімі ж памяркоўнымі, добразычлівымі. Яны перанялі ў беларусаў мову, побыт, некаторыя звычаі і традыцыі, а ўменне самааддана працаваць на зямлі, вырошчваць высокія ўраджаі і нават некалькі за сезон перанялі ў татараў суседзі: беларусы, палякі, якія пражываюць побач. І на прыкладзе ўзаемаадносін, якія існуюць паміж татарамі і іншымі супольнасцямі, можна будаваць свет узаемапавагі, дапамогі, разумення.

З’яўленне ў ВКЛ цюрка-татарскага насельніцтва стала вынікам безупынных і разнастайных зносін з Залатой Ардой. І гэта быў не толькі бясконцы перыяд барацьбы, супрацьстаяння. Ім здаралася заключыць саюзы супраць агульных ворагаў. Татары ўдзельнічалі ў вайне Гедыміна з крыжакамі яшчэ ў 1319 г. У 1350 г. ардынскія атрады ішлі разам з войскамі вялікага князя Кейстута ў паход супраць Польшчы. Аднак пачатак цеснага супрацоўніцтва ардынцаў з ВКЛ звязаны з імем хана Тахтамыша. Пасля таго як войскі хана былі разбіты вялікім заваеўнікам Цімурам, са сваіх заходніх зямель хан уцек у ВКЛ, да двара Вітаўта, сына Кейстута. Татарам, што прыйшлі разам з ім, былі выдзелены землі ва Украіне, сам хан Тахтамыш пасяліўся ў Лідзе. Многія лічаць, што іўеўскія татары з’явіліся ў нашым горадзе ў канцы XIV – пачатку XV ст. Паводле пісьмовых крыніц татары каля Іўя пасяліліся ў 1652 г.

Беларускія татары з’яўляюцца мусульманамі-сунітамі. Татарамі Беларусі і Іўя ў прыватнасці найбольш ушаноўваўся звычай міласэрнасці. Ен грунтаваўся на ісламскай традыцыі садагі – раздачы падарункаў жабракам. Гэты звычай стаў нормай добразычлівых адносін у абшчыне. Ахвярны падарунак – ялмузу (печыва, агароднiна, ласункі, блаславеныя малітвай) даравалі не толькі жабракам, але і суседзям, знаемым. Асаблівы клопат праяўляўся пра старых і сірот. Татарын, які меў вялікую сям’ю, абавязаны быў выхаваць і сіроцкае дзіця. Лічылася, што адкупіцца ад грахоў можна было, накарміўшы жабракоў. Рытуал садагі выконваўся без хвальбы і думак аб спажыве, верылі, што гэта была воля Алаха.

Да добразычлівых спраў адносіліся і ахвяраванні на мячэць і духоўнікаў (мулаў, муэдзінаў). Паломніцтва ў Мекку (хадж) – гэта нават адзін з падмуркаў ісламу. Мусульманін, пабыўшы ў Меццы, змывае з сябе ўсе свае грахі. З Іўя ў Меццы былі Якуб Радкевіч і Барыс Сафарэвіч.

Крыніцай рэлігійных ведаў татарскага насельніцтва ў Іўі з'яўлялася іх пісьменнасць, якая захавалася ў выглядзе рукапісных кітабаў і хамаілаў. Кітабы – кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Кітабы ствараліся з XVI ст. татарамі, што пасяліліся на Беларусі і ў Літве ў XIV–XV ст. і паступова забыліся на сваю родную мову. Змест кітабаў – усходнія легенды, казкі, прыгодніцкія аповесці, апісанні мусульманскіх рытуалаў. Кітабы напісаны і чытаюцца справа налева, тэкст пачынаецца там, дзе ў славянскіх кнігах заканчваецца. Колькасць старонак – ад 70 да 1000. Радок суцэльны, няма падзелу на словы, знакаў прыпынку, вялікай літары. Новы твор (раздзел) пачынаецца словам «баб» (раздзел, пачатак новага зместу) ці «хікайет» (аповесць, апавяданне). Іншы раз гэтых слоў няма, тады на палях выпісваюцца першапачатковыя словы (першы сказ) раздзела. Мова кітабаў адрозніваецца ад мовы старажытных беларускіх пісьмовых помнікаў, яна блізкая да беларускай народнай мовы. У кітабах адлюстраваны побыт, звычаі, традыцыі татар-перасяленцаў. Кожная татарская сям’я мае Каран, а на сценах – вытрымкі з Карана прыгожа аформлены ў рамках і на галоўным месцы ў доме.

Татары Іўя захавалі звычаі святкавання традыцыйных свят. Напрыклад, Рамадан-байрам (Ураза-байрам) адразу ж пасля сканчэння месяца посту Рамадана. Гэта светлае свята маральнага ўдасканалення, імкнення чалавека да пабожнасці

з'яўляецца неад'емнай часткай шматвяковай айчыннай духоўнай спадчыны. Яно захвочвае да сяброўства і еднасці, да дабрыні і спагады, дапамогі. Адзначаюць татары і Кадр-ноч, ноч Прадвызначэння. У 27 дзень месяца Рамадана Алах падараваў прароку Мухамеду свяшчэнную кнігу – Каран. Свята Курбан-байрам (свята Ахвярапрынашэння) адзначаецца чатыры дні. У гэты час мусульмане здзяйсняюць Хадж – падарожжа ў святыя месцы – Мекку і Медыну, каб памаліцца і вярнуцца дадому. Тым, каму пашчасціла трапіць туды, дазваляецца насіць чалму на галаве і да іх імя дадаецца ганаровы тытул хаджы. Першы дзень месяца Мухарэма (студзень) святкуецца як Новы год. Яшчэ адно ўрачыстае свята Ашура-байрам адзначаецца ўрачыстажалобнымі цырымоніямі, якія адбываюцца праз 10 дзень месяца Мухарэма. Свята ўведзена ў памяць аб пакутніцкай смерці імама аль-Хусэйна – унука прарока Мухамеда. З сямі дзен тыдня беларускія татары лічаць пятніцу святочным днем. Гэта дзень адпачынку ад фізічнай працы, але дзень узмоцненай духоўнай працы. Вернікі наведваюць мячэць. Менавіта ў пятніцу нарадзіўся прарок Мухамед. Асаблівай адметнасцю адзначаюцца і абрады беларускіх татар. Напрыклад, вяселле спалучае элементы беларускай культуры з элементамі мусульманскага рэлігійнага рытуалу.

Як бачна, беларускія татары сення з'яўляюцца не толькі цікавымі сведкамі старажытных татарскіх звычаяў і абрадаў, але і ахоўнікамі элементаў старадаўніх беларускіх традыцый, які сёння выкарыстоўваюцца ўсе радзей і радзей. Даследаванне этнакультурнага набытку Іўеўшчыны паказвае, што беларуская зямля спрадвеку была ўрадлівай глебай для развіцця нацыянальных культур на аснове агульначалавечых каштоўнасцяў. На прыкладзе татарскай супольнасці Беларусі яскрава бачна, што сучасная палітыка нашай дзяржавы, накіраваная на развіцце агульнага дабрабыту і ўзаемапавагі, мае глыбокія карані, страчваць якія ні ў якім разе нельга. Прыемна ўсведамляць, што ў незалежнай Беларусі гэта традыцыя захоўваецца і культывуецца на дзяржаўным узроўні.